Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 28 (48) | Нядзеля, 22 ліпеня 1945 г. | Цана 15 кап.

## УБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ—ВЫСОКУЮ АРГАНІЗОВАНАСЦЬ

На палях нашага раёна вырас багаты ўраджай. Напружаная праца ў перыяд веснавой сяўбы прынесла свае выдатныя плады.

Зараз працоўнае сялянства нашага раёна ўшчыльную падышло да ўборачнай кампаніі. Пачынаючы з 20 ліпеня, многія сялянкі выйшлі на жніво. З заўтрашняга дня пачнуцца масавыя ўборачныя работы. Багаты ўраджай—узнагарода сялянiну за яго крапатлівую працу—патрабуе своечасовай і добраякаснай уборкі.

У параўнанні з даваенным часам у нашым раёне значна скарацілася колькасць уборачных машын, не хапае цяглавай сілы. Пагэтаму на ўборцы, як і на сяўбе, трэба праявіць высокую арганізаванасць, аказваючы ўзаемадапамогу бясконным і маламоцным гаспадаркам.

Адначасова з уборкай неабходна прывесці ў належны парадак гумны, навесы, адрамантаваць усе наяўныя малатарні, веялкі, каб своечасова прыступіць да малацьбы і здачы хлеба па дзяржаўных абавязацельствах.

Уборка ўраджаю і нарыхтоўка сельгаспрадуктаў у гэтым годзе—адна з важнейшых задач, якая стаіць перад партыйнымі і совецкімі органамі, перад усімі сялянамі і сялянкамі нашага раёна.

З часцю выканаць гэту задачу, — значыць даць краіне і арміі дастатковую колькасць хлеба, садзейнічаць хутчэйшаму адраджэнню нашай Радзімы.

СЯЛЯНЕ І СЯЛЯНКІ! У СЦІСЛЫ ТЭРМІН УБЯРОМ БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ. УСЕ СІЛЫ НА УБОРАЧНЫЯ РАБОТЫ!

## ПРЫБЫЦЦЁ У БЕРЛІН І. В. СТАЛІНА І В. М. МОЛАТАВА

**БЕРЛІН, 17 ліпеня. (ТАСС). 16 ліпеня ў Берлін прыбылі Старшыня Совета Народных Камісараў СССР Генералісімус І. В. Сталін і Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў.**

## АДКРЫЦЦЁ КАНФЕРЭНЦЫІ ГЛАЎ ТРОХ ВЯЛІКІХ ДЗЯРЖАЎ У БЕРЛІНЕ

(КАМЮНІКЕ)

Берлінская Канферэнцыя Глаў Урадаў Вялікабрытаніі, Злучаных Штатаў Амерыкі і Совецкага Саюза адкрылася сёння ў 5 гадзін пасля поўдня.

Прэзідэнт Злучаных Штатаў быў запрошан яго двума калегамі старшынстваваць на паседжаннях Канферэнцыі. Меў месца папярэдні абмен думкамі адносна пытанняў, патрабуючых рашэння Глаў трох Урадаў.

Рашано, што тры Міністры Замежных Спраў будуць рэгулярна сустракацца ў мэтах ажыццяўлення падрыхтоўчай работы Канферэнцыі.

Берлін,
17 ліпеня 1945 г.

## Яны вярнуліся да мірнай працы

20 ліпеня вярнуліся на радзіму з дзеючай Чырвонай Арміі дэмабілізаваныя байцы Гардзейка Сямён Лук'янавіч, Гардзейка Лявон Грыгор'евіч—жыхары вёскі Рацкевічы Бусяжскага сельсовета і Акавіты Фёдар Макаравіч, жыхар вёскі Хадоркі Грыўдзенскага сельсовета.

Перш чым накіравацца да хаты, яны рашылі зайсці ў райком партыі, каб даведацца, што новага і чым жыве раён.

Сакратар РК КП(б)Б т. Юшкевіч расказаў дэмабілізаваным, аб тых вялікіх задачах, якія стаяць перад працоўнымі раёна ў сучасны момант. Адна з важнейшых задач—гэта ў сціслы тэрмін і добраякасна правесці ўборку ўраджаю, датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па хлебапастаўках.

Тав. Юшкевіч пажадаў дэмабілізаваным поспехаў на фронце аднаўленчай працы.

—Вярнуўшыся з арміі вялікага Сталіна,—сказаў Акавіты Фёдар,—мы не пашкадуем сіл, каб быць карыснымі для радзімы кожны на сваім месцы. Дзякуем Совецкай уладзе, за яе вялікія клопаты аб кожным совецкім чалавеку.

Яны выйшлі з райкома і накіраваліся да сваіх родных вёсак, да сваіх сем'яў, да мірнай творчай працы.

## Абарудавалі клуб

Комсамольцы вёскі Яблонка сваімі сіламі адрамантавалі і абарудавалі клуб. Праз некалькі дзён у клубе закіпіць творчая комсамольская работа. Тут будуць працаваць палітгурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці.

## ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову „Аб уборцы ўраджаю і нарыхтоўках сельскагаспадарчых прадуктаў у 1945 годзе“. Кіраўнікі мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, хлебаробы, бавоўнаробы, буракаводы—усе работнікі соцыялістычнага земляробства атрымалі разгорнутую праграму ўборачных і нарыхтоўчых работ.

Соўнарком СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) ставяць перад совецкімі, партыйнымі, зямельнымі і нарыхтоўчымі органамі, Наркамземам СССР, Наркамсоўгасаў СССР, Наркамзагам, Наркамхарчпромам, Наркаммясамалпромам СССР, Цэнтрасаюзам, перад усімі калгасамі, МТС і соўгасамі задачу мабілізаваць усе сілы і сродкі калгасаў, МТС і соўгасаў на тое, каб у сціслыя тэрміны і без страт убраць ураджай і своечасова выканаць па кожнай культуры планы нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў.

Як указваюць Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б), выкананне гэтай задачы мае ў бягучым годзе важнейшае ўсенароднае значэнне для хутчэйшай ліквідацыі вынікаў вайны і аднаўлення ў найкарацейшыя тэрміны ўсіх галін народнай гаспадаркі нашай краіны.

Уборка ўраджаю зернавых культур павінна быць закончана не больш чым за 18-20 рабочых дзён.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) звяртаюць асобую ўвагу ўсіх партыйных, совецкіх, нарыхтоўчых, зямельных органаў, МТС, калгасаў і соўгасаў на неабходнасць своечасовага і арганізаванага правядзення нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў.

„Зараз няма больш важнай гаспадарча-палітычнай задачы для ўсіх партыйных, совецкіх, нарыхтоўчых арганізацый, для сельскіх комуністаў, комсамольцаў, калгаснікаў, калгасніц, работнікаў МТС і соўгасаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі,—гаворыцца ў пастанове,—як своечасовая і добрая падрыхтоўка і правядзенне ўборкі ўраджаю без страт, выкананне кожным раёнам, калгасам і соўгасам сваіх абавязацельстваў па здачы сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве“.

(ТАСС).

Насустрач дню чыгуначніка

## ПА МЕТАДУ КАЗАНЦАВА

Ідучы насустрач Сталінскаму дню чыгуначніка рабочыя 3-й дыстанцыі пуці па метаду знатнага чыгуначніка Казанцава ў вольны ад работы час выходзяць на бягучы рамонт пуці.

З пуцявых і маставых вартаўнікоў створана 21 брыгада, у якіх аб'яднаны 111 чалавек.

Гэтыя брыгады зрабілі ўзмацненне крывых на працягу 400 метраў, адрамантавалі 5 кілометраў пуці.

Добра працуе брыгада тав. Кашчэева. Яна адрамантавала 2 станцыйных пуці.

Усе рабочыя дыстанцыі спаборнічаюць за лепшую сустрэчу свайго свята—Сталінскага дня чыгуначніка.

Сакратар партарганізацыі 3-й дыстанцыі пуці Цішчанка.

Маленькі фельетон

## ТРЫ СПРОБЫ І АДНА ЎДАЧА

Ёсць у Івацэвічах месца, дзе звычайна наклейваюцца рэкламы. І паведамляюць гэтыя рэкламы аб тым, які кінофільм будзе дэманстрыравацца ў клубе ў той або іншы вечар.

Мы не будзем гаварыць аб многіх кіносеансах, за якія заплочаны грошы, а прагледзець да канца так і не ўдавалася. Хочацца расказаць на ўвесь свет, якія мукі перацярпеў у руках Івацэвіцкіх кіномеханікаў фільм „Зоя“.

Тры разы загадчык клуба тав. Бутовіч рабіла спробу паказаць гэты выдатны фільм глядачу і... нічога не выйшла.

У першы раз не завёўся матор дынамарухавіка. Людзі праседзелі ў клубе да 12 гадзін ночы і разышліся, праклінаючы і заг. клуба і кіномеханікаў.

Назаўтра фільм быў прадэманстраваи з горам папалам. На трэці раз адказаў кінапарат.

Тады тав. Бутовіч рашыла паслаць кіноперасоўку ў Баўсу з надзеяй, што там шчаслівейшае месца. Але і там нічога не выйшла—адказала апаратура.

І так, з трох спроб адна ўдалая ўдача.

Гледзячы на такую работу, так і хочацца сказаць словамі Крылова:

„Чтобы играть, то надобно
уменье...
А вы, друзья, как ни садитесь
в музыканты не годитесь...“

Ігру на нервах гледача трэба спыніць.

А. К.

## ЗВОДКА

Аб ходзе сенаўборкі па Косаўскаму р-ну на 20 ліпеня

| № | Назва сельсоветаў | Проц. выкан. |
|---|---|---|
| 1 | Грыўдзенскі | 105 |
| 2 | Івацэвіцкі | 100 |
| 3 | Косаўскі | 100 |
| 4 | Яблонскі | 96,1 |
| 5 | Альшаніцкі | 35,7 |
| 6 | Любішчыцкі | 30,7 |
| 7 | Бусяжскі | 26,7 |
| 8 | Яглевіцкі | 17,6 |
| 9 | Альбінскі | 17 |
| 10 | Жытлінскі | 19 |
| 11 | Гошчаўскі | 13 |
| 12 | Сенькавіцкі | 11,7 |
| 13 | Стайкаўскі | 7,4 |
| 14 | Падстарынчскі | 5,4 |
| 15 | Белавіцкі | 2,2 |
| | Усяго па р-ну | 48.5 проц. |

## Пачалося жніво

20 ліпеня выйшлі ў поле жнеі ў Сенькавіцкім, Любішчыцкім, Ягловіцкім і другіх сельсоветах. Зжаты першыя снапы збожжа. З панядзелка ў раёне пачнуцца масавыя ўборачныя работы.

Адказны рэдактар А. П. РУДОЙ.

Г Л 15275. Адрас рэдакцыі: гарадскі пасёлак Івацэвічы, вул. Шасейная, [illegible]